УДК 343.95

# БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ РЭСПУБЛІКА, ЯК КРОК ДА НЕЗАЛЕЖНАСЦІ КАНСТЫТУЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ: ГІСТОРЫКА-ПРАВАВЫ АГЛЯД

**Молчан Андрэй Васільевіч,**
Лапіцкая сярэдняя школа
(Магілёўская вобласць, Асіповіцкі раён, а/г Лапічы, Беларусь)

*У дакладзе паведамляецца аб адным з гістарычных этапаў фарміравання і станаўлення незалежнай беларускай дзяржавы. Такім этапам з'яўляецца Беларуская Народная Рэспубліка. Даецца гісторыка-прававая характарыстыка ўмоў і працэсаў у сувязі з міжнароднымі абставінамі, у якіх знаходзілася Беларусь у пачатку XX стагоддзя. Таксама дадзена адзнака існавання БНР і яе ўплыў на станаўленне незалежнай Рэспублікі Беларусь.*

У кожнай краіны ёсць свой уласны шлях станаўлення і развіцця. Такі шлях мае і Беларусь. У 2018 годзе беларуская гісторыя адзначыла сваю чарговую круглую дату, адну са шматлікіх і важных падзей гістарычнага станаўлення і развіцця Беларусі – 100 гадоў Беларускай Народнай Рэспублікі. Гэтая падзея з'яўляецца лёсавызначальнай у працэсе станаўлення сучаснай незалежнай Рэспублікі Беларусь, бо, як вядома, Канстытуцыя 1994 года юрыдычна замацавала ўжо дзяржаву, якая ствралася не адно дзесяцігоддзе і нават стагоддзе. Адной з такіх частак на шляху да Канстытуцыі стала таксама і Беларуская Народная Рэспубліка (БНР).

Падчас Першай Сусветнай вайны склаліся ўмовы для самавызначэння многіх народаў. Выключэннем не стаў і беларускі народ. У 1903 годзе беларускімі палітычнымі дзеячамі была заснавана партыя Беларуская Сацыялістычныя Грамада (БСГ). Партыя мела сацыялістычны характар і ставіла перад сабой у першую чаргу вырашэнне сацыяльных пытанняў насельніцтва і была першай партыяй, якая несла ў сабе менавіта беларускі каларыт. У 1917 годзе, ва ўмовах падзення самадзяржаўя ў Расіі, БСГ бярэ на сябе галоўную ролю вырашэння беларускага нацыянальнага пытання. Трэба таксама адзначыць, што ў вырашэнні гэтага пытання прымалі ўдзел і іншыя палітычныя групы і колы. Пасля рэвалюцыі, якая адбылася ў лютым 1917 года і падзення расійскага самадзяржаўя, з'явілася думка аб скліканні Усебеларускага з'езда. Асноўная падрыхтоўка да з'езда зясяродзілася ў двух цэнтрах – Вялікай Беларускай радзе (у асноўным прыхільнікі БСГ) і Беларускім абласным камітэце ў Петраградзе [6, с. 15].

У кастрычніку 1917 года адбылася новая рэвалюцыя, вынікам якой стаў пераход улады ў Расіі да бальшавікоў. У снежні 1917 года, дзякую-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

чы вялікім намаганням, бо гэта было вельмі складана ва ўмовах баявых дзеянняў і рэвалюцыі, удалося арганізаваць у Мінску Усебеларускі з'езд. У з'ездзе прынялі ўдзел 1872 дэлегаты з усіх частак беларускай зямлі. Дэлегаты прадстаўлялі розныя колы беларускага грамадства, а таксама палітычныя партыі і рухі. Першапачаткова з'езд не ставіў перад сабой пытанне аб незалежнасці Беларусі. Пытанне стаяла толькі аб вырашэнні лёса беларускага краю ў склаўшыхся ўмовах. Разглядаўся варыянт нацыянальнай аўтаноміі ў складзе Расіі. Аднак ужо падчас правядзення з'езду, дэлегаты выказаліся за стварэнне незалежнай Беларусі, аб далейшым самастойным шляху беларускага народа у сваёй уласнай дзяржаве. Пасля гэтага бальшавікі, якія прысутнічалі на з'ездзе, пакінулі яго. Праз некаторы час яны вярнуліся і з дапамогай зброі разагналі яго. Чаму ж гэта адбылося? Справа ў тым, што бальшавікі ўбачылі пагрозу сваёй уладзе на тэрыторыі Беларусі і, безумоўна, ніякую незалежную Беларусь, адасобленую ад Савецкай Расіі, бачыць не жадалі.

Далей бальшавікі ва ўмовах Першай сусветнай і распачаўшайся Грамадзянскай вайны робяць усё, каб захаваць сваю ўладу. Таму яны распачынаюць перамовы з Германіяй, каб заключыць мір без кантрыбуцый і рэпарацый. Але ў той сітуацыі ставіла ўмовы Германія, якая хоць і праігрывала вайну, аднак мела баяздольнае войска, у адрозненне ад бальшавікоў, якія яшчэ толькі фарміравалі Чырвоную Армію. Таму германскія войскі пачалі наступленне, заняўшы значную тэрыторыю Беларусі.

У такіх умовах беларусам неабходна было ратаваць свой край, бо яго дзялілі паміж сабой Германія і Савецкая Расія, не ўлічваючы наяўнасць у гэтым краі самастойнага народа, са сваім поглядам на далейшы лёс. 3 сакавіка 1918 года ў Брэст-Літоўску была падпісана дамова, згодна якой большая частка Беларусі адыходзіла да Германіі. У адказ на гэта беларусы, насуперак дамове, 9 сакавіка абвяшчаюць Беларускую Народную Рэспубліку, а 25 сакавіка – яе Незалежнасць.

Наступныя рашэнні і дзеянні беларускіх нацыянальных дзеячаў вельмі складаныя і цяжкія для аналізу і правільнага асэнсавання. Але, калі прадставіць і ўявіць прад сабой цяжкія ўмовы таго часу і складанасць вырашаемага пытання, ад якога залежыў лёс цэлага народа, то шматлікія нападкі зусім не справядлівыя, і часам крыўдныя ў адносінах да тых людзей, якія стварылі і спрабавалі адстаяць беларускую незалежную дзяржаву ўсімі даступнымі на той момант сродкамі.

Лёс і гісторыя па-свойму размеркавалі планы наконт Беларусі, выдзяліўшы зусім малы адрэзак часу для існавання БНР. Прыходзілася дзейнічаць ва ўмовах германскай акупацыі. Германская акупацыйная ўлада адмоўна адносілася да наяўнасці БНР на тэрыторыі, якую яны лічылі сваёй



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

згодна дамове, падпісанай у Брэст-Літоўску з бальшавікамі. Адмаўлялі немцы існаванне БНР нават на падкантрольных іх уладзе ўмовах. Таму ў дадзеных умовах Рада БНР, не знайшоўшы іншага выйсце, звярнулася з тэлеграмай да Канцлера Германіі і акупацыйных улад. Аднак лёс самой Германіі на той момант быў амаль што вызначаны. Вядома ж, не на яе карысць.

Германія і яе хаўруснікі пацярпелі паражэнне ў Першай сусветнай вайне. У Версалі вызначаўся лёс пасляваеннага свету. Вырашаўся далейшы лёс многіх краін і народаў, у тым ліку і беларускага. Усе юрыдычныя патрабаванні для самавызначэння новых дзяржаў, якія вызначылі ў Версалі, беларусы на той момант не мелі, бо мірная дамова, падпісаная ў Брэст-Літоўску была скасаваная. Разам з гэтым трэба адзначыць, што пытанне самавызначэння нацый прадугледжвалася вырашыць шляхам задавальнення ўсіх добра абаснаваных нацыянальных жаданняў, але пры ўмове, што гэта не парушыць мір Еўропы, не створыць новых антаганізмаў” [1, с. 117]. Таксама “планавалася, што адбудзецца прызнанне дэ-факта правоў малых дзяржаў, якія адкалоліся ад Расійскай імперыі, пры ўмове склікання імі нацыянальных сходаў і стварэння ўрадаў дэ-юрэ”[1, с. 118]. Трэба падкрэсліць, што Беларусь на той момант мела такую з’яву, як Нацыянальны сход, якім з’яўляўся праведзены Усебеларускі сход у снежні 1917 года, і свой уласны ўрад – Рада БНР.

Але, нягледзячы на ўсё вышэйсказанае, сусветная палітычная і ваенная грамадскасць свету вырашыла, што Беларусь не можа быць самастойнай дзяржавай, а яе тэрыторыя – гэта спрэчнае пытанне паміж "новаспечанымі" незалежнымі дзяржавамі – Польшчай ды Савецкай Расіяй. Тым самым парадзіўшы небяспеку для Еўропы, бо ў хуткім часе пачалася вайна паміж гэтымі новымі дзяржавамі за тэрыторыю Беларусі. Таксама гэта рашэнне вызначыла далейшы лёс Беларусі, адцягнуўшы пытанне стварэння незалежнай Рэспублікі Беларусь ажно да 1991 года, юрыдычна замацаваўшы яго ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 года.

Што ж паспелі беларусы зрабіць за кароткі перыяд існавання БНР, адведзены ім гісторыяй? Асноўныя напрамкі дзейнасці Рады былі ў асноўным у культурніцкім накірунку, а таксама ў знешнепалітычнай дзейнасці. Былі створаны Беларускі дзяржаўны тэатр і Беларуская дзяржаўная кансерваторыя. У красавіку 1918 года было прынята рашэнне аб стварэнні Беларускага Нацыянальнага ўніверсітэта. Але адкрыць яго не паспелі. Таксама была створана дыпламатычная служба. Дзяржаўнай мовай БНР стала беларуская. Сталіцай – горад Мінск. З’явілася і такая рэч, як наяўнасць грамадзянства, якое замацоўвалася ў пашпарце БНР [8, с. 35]. Для вырашэння эканамічных пытанняў была створана Беларуская гандлёвая палата, у якую пачалі паступаць заказы на пастаўку тавараў з Украіны і Расіі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Такім чынам, Беларуская Народная Рэспубліка мела атрыбуты дзяржаўнасці, якія мае сучасная незалежная Рэспубліка Беларусь, замацаваныя Канстытуцыяй. Але пры гэтым не паспела стаць паўнавартаснай дзяржавай. Сваю ўласную Канстытуцыю Рада БНР так і не паспела стварыць. Быў створаны толькі яе праект, згодна якому маладая беларуская рэспубліка з'яўлялася сацыяльна арыентаванай дзяржавай і па форме праўлення павінна была быць парламенцкай рэспублікай. У час вялікіх перамен беларусы змаглі даказаць сваё жаданне стварэння ўласнай незалежнай дзяржавы яшчэ сто гадоў назад. І гэтыя ідэя і жаданне ўжо напрыканцы XX стагоддзя ператварыліся ў незалежную Рэспубліку Беларусь. Але трэба помніць і разумець, што незалежнасць беларусы атрымалі дзякуючы вялікім намаганням, і таму задача сённяшняга і будучых пакаленняў зберагчы і захаваць яе.

## Спіс крыніц


1. Бароўская, В. М. Беларускае пытанне на савецка-польскіх перагаворах 1918–1921 гг. / В. М. Бароўская. – Мінск : Беларуская навука, 2017. – 269 с.
2. Беларуская Народная Рэспубліка – крок да незалежнасці: да 100-годдзя абвяшчэння: гістарычны нарыс / А. А. Каваленя [і інш.] ; Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут гісторыі. – Мінск : Беларуская навука, 2018. – 157 с.
3. Брыгадзін, Д. П. Беларуская Народная Рэспубліка ў 1918 г. / Д. П. Брыгадзін, П. І. Брыгадзін // Журнал Белорусского государственного университета. История. – 2018. – № 3. – С. 10–16.
4. Конституция Республики Беларусь 1994 года (с изменениями и дополнениями, принятыми на республиканских референдумах 24 ноября 1996 г. и 17 октября 2004 г.). – Минск : Амалфея, 2014. – 48 с.
5. Мазец, В. Беларуская Народная Рэспубліка: асноўныя вехі станаўлення / В. Г. Мазец // Беларускі гістарычны часопіс. – 2018. – № 3. – С. 19–24.
6. Рудовіч, С. Іх звала Беларусь святая: да 100-годдзя Усебеларускага з'езда 1917 года / С. Рудовіч, В. Герасімаў. – Мінск : Кнігазбор, 2017. – 84 с.
7. Рудовіч, С. БНР як праваобраз дэмакратычнай, прававой, сацыяльнай дзяржавы ў Беларусі / С. С. Рудовіч // Беларускі гістарычны часопіс. – 2018. – № 3. – С. 25–29.
8. Унучак, А. Спадчына БНР, актуальная сёння (Што дала нам БНР?) / А. У Унучак // Беларускі гістарычны часопіс. – 2018. – № 3. – С. 30–36.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова